партийности, социального статуса и национальности. Организация ставит своей целью защиту прав и законных интересов молодежи, способствование установлению демократического и гражданского общества в Беларуси, расширению в стране идеалов и ценностей демократического социализма (свобода, равенство, солидарность, социальная справедливость, приоритет прав человека).

Однако несмотря на то, что в Беларуси имеется в наличии значительное число молодежных организаций различной политической ориентации, социологические исследования показывают индифферентное отношение молодежи к политике. Только около 10% работающей и 15% учащейся молодежи принимает какое-либо участие в деятельности молодежных организаций и движений. Около 30% молодежи не видит в общественно-политической деятельности никакого смысла [1]. Одновременно следует признать, что, если политика как ценностная ориентация в целом не занимает молодежь, ее политические идеалы находятся в стадии глубокой трансформации. Вместе с тем в стране имеется определенный пласт (около 10%), готовый к активному участию в общественно-политической жизни. Он и составляет ядро различных молодежных общественно-политических организаций и движений [2].

ЛИТЕРАТУРА

1. Бабосов Е. Молодежь Беларуси на пороге XXI в. // Беларуская думка. – 1999. – № 6. – С. 37.

2. Котляров И., Новикова В. Молодежь выбирает // Беларуская думка. – 1998. – 3. – С. 24.

УДК 947.6

А.А. Райчонак, асістэнт

## ДА ПРАБЛЕМЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ІДЭІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў 1923–1927 ГГ.

The article analyses the problems of Belarussian statehood in 1923–1927.

У гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці перыяд 1923–1927 гг. вызначаецца чатырма ключавымі падзеямі. Гэта стварэнне СССР, вяртанне ў склад БССР усходніх тэрыторый, самаліквідацыя Рады міністраў БНР і прыняцце II Канстытуцыі БССР.

Праблема існавання беларускай дзяржаўнасці пасля ўтварэння СССР у нацыянальнай гістарычнай навуцы да сённяшняга дня не атрымала неабходнага тлумачэння. Пасля змены гістарычнай парадыгмы ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. узнікла некалькі накірункаў у яе даследаванні, кожны з якіх спрабаваў выпрацаваць пэўны метадалагічны падмурак для сваёй канцэпцыі. Асаблівыя цяжкасці ўзнікаюць пры тлумачэнні статусу БССР у складзе СССР. Калі савецкая гістарычная школа адназначна сцвярджала, што БССР – гэта незалежная дзяржава, якая добраахвотна ўвайшла ў СССР і, нягледзячы на перадачу пэўных паўнамоцтваў цэнтральнаму кіраўніцтву, захоўвала ўсе прыкметы дзяржаўнага суверэнітэту, то яе апаненты ўвогуле не былі схільныя разглядаць БССР у якасці дзяржаўнага ці праддзяржаўнага ўтварэння. Здаецца, і тое і другое з'яўляецца перабольшваннем. Зразумела, рэальным суверэнітэтам БССР не валодала, але нельга адмаўляць і той факт, што пасля распаду СССР атрымаць і замацаваць незалежнасць змаглі толькі тыя краіны, якія на гэты

момант мелі статус саюзнай рэспублікі. Акрамя таго, разуменне суверэнітэту ў пачатку XX в. у пэўнай ступені адрозніваецца ад сучаснага.

Напэўна, можна лічыць зусім праўдзівым і тое, што сярод задач, якія вылучаліся кіраўніцтвам БССР, на першым месцы стаяла не замацаванне суверэнітэту, а збіранне ці, дакладней, вяртанне ў склад БССР беларускіх этнаграфічных земляў.

Стварэнне СССР рабіла гэтыя намаганні зусім рэальнымі. У новых абставінах цэнтральнае кіраўніцтва магло больш не хваляваццa страціць гэтыя землі ў выніку падзення савецкай улады на Беларусі (у першую чаргу з прычыны замежнай інтэрвенцыі), што і паспяшаліся скарыстаць беларускія бальшавікі.

Узбуйненне Беларусі можна лічыць перамогай мясцовых камуністаў, якім удалося пераламіць супраціўленне губернскіх улад і пераканаць цэнтральнае кіраўніцтва ў палітычнай і эканамічнай яго мэтазгоднасці. Фактычна з гэтага часу БССР магла прэтэндаваць на ролю адзінага беларускага цэнтра, што на фоне становішча беларусаў у Польшчы, якое пагаршалася, выглядала зусім натуральна.

Увогуле, узгаданы час характарызуецца супярэчлівымі тэндэнцыямі ў развіцці беларускага нацыянальнага руху. З аднаго боку, адбываецца збліжэнне часткі нацыянальна-дэмакратычнага накірунку з прадстаўнікамі савецкай арыентацыі, з другога –канчатковы разрыў камуністаў з той часткай нацыянал-дэмакратызму, з якой не атрымалася дамовіцца.

Акрамя таго, да супярэчлівасцяў магчыма аднесці і той факт, што відавочная страта суверэнітэту пасля стварэння СССР не прывяла да згортвання нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў дадзены перыяд у БССР, больш таго, ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі ва ўзгаданы час выклікала ўздым беларускай культуры і згуртаванне беларускіх сіл на савецкай аснове.

Перадумовай першай тэндэнцыі было істотнае змяненне міжнароднай абстаноўкі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Фактычны прарыў Савецкай Расіі на міжнародную арэну пасля заключэння Рапальскай дамовы і Генуэзскай канферэнцыі рабіў яе суб'ектам міжнароднага права, не ў меншай ступені зацікаўленым у стабілізацыі міжнароднага становішча, чым усе іншыя краіны. З гэтай нагоды адбываецца паступовае адмаўленне ад ідэі тэрміновай сусветнай рэвалюцыі. На фоне такой стабілізацыі, якая назіралася пасля ўзрушэнняў I сусветнай вайны, любое нявырашанае нацыянальнае пытанне выглядала небяспекай у дачыненні да ўсталяванай Версальскай сістэмы.

Што тычыцца сітуацыі ў Савецкай Беларусі, то яна была не менш, а можа і больш складанай. Сярод кіраўніцтва БССР было шмат сапраўдных патрыётаў сваёй краіны, таму яны не маглі без болю ўспрыняць падзел Беларусі, які адбыўся ў Рызе. Праўда, у той час у іх было яшчэ спадзяванне на вяртанне заходніх земляў, але пасля таго, як цэнтральнае кіраўніцтва ў 1924 г. прыняло рашэнне аб адмове ад курсу на ўзброенае паўстанне, у Заходняй Беларусі гэтыя спадзяванні набылі эфемерны характар.

У 1923 г. правальваецца авантура Камінтэрна па арганізацыі рэвалюцыі ў Германіі, на падрыхтоўку якой фактычна быў патрачаны залаты запас краіны. Бальшавіцкаму кіраўніцтву становіцца зразумелым, што неабходна адмаўляцца ад курсу на тэрміновую сусветную рэвалюцыю і прыстасоўвацца да новай палітычнай рэчаіснасці.

У гэтых умовах даволі лёгка было страціць веру ў перспектыву беларускага руху. Але ўзбуйненне тэрыторыі рэспублікі, якое адбылося ў гэты час, выклікала ва ўсіх беларускіх палітычных колах уздым спадзяванняў на хуткае вырашэнне беларускага

пытання. У дадзеных абставінах БССР пачынае выглядаць як ядро, вакол якога павінны гуртавацца ўсе палітычныя сілы Беларусі. Гэта тлумачыцца тым, што сама наяўнасць рэспублікі сведчыла аб рэалізацыі ў пэўным выглядзе ідэі беларускай дзяржаўнасці. Разам з тым палітыка беларусізацыі аб'ектыўна стварала спрыяльныя ўмовы для развіцця беларускай культуры, што на фоне яўна антыбеларускай палітыкі польскага ўрада ў Заходняй Беларусі вабіла да сябе ўсе нацыянальна-культурныя колы па той бок мяжы. Да таго ж, новая эканамічная палітыка савецкага ўрада выклікала спадзяванні на паступовую эвалюцыю расійскага камунізму ў бок сацыял-дэмакратызму. Зараз мы можам зазначыць беспадстаўнасць такіх спадзяванняў, але ў тых абставінах гэта магло выглядаць зусім натуральна.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна зазначыць, што ўвасабленне беларускай нацыянальнай ідэі адбылося не ў поўным аб'ёме. Ідэал пабудовы нацыянальнай, незалежнай дзяржавы так і застаўся нерэалізаваным. Гэта абумоўлівалася і адноснай слабасцю нацыянальна-дэмакратычнай плыні беларускага руху, і своеасаблівым разуменнем праблем дзяржаўнасці сярод беларускіх камуністаў, якія былі схільныя ставіць на першы план класавыя, а не нацыянальныя пытанні. З другога боку, культурніцкая складаючая нацыянальнай ідэі была рэалізавана амаль у поўным аб'ёме. Гэта і адкрыццё беларускіх школ, і стварэнне сістэмы вышэйшай адукацыі, і падтрымка беларускай культуры з боку дзяржавы, і многае іншае, што атрымала абагульняльную назву – беларусізацыя. У нейкім сэнсе гэта дэзарыентавала прадстаўнікоў беларускага руху як нацыянальна-дэмакратычнага, так і савецкага лагера. З усталяваннем у СССР дыктатарскага рэжыму іх сталі разглядаць у якасці ворагаў улады, а потым менавіта на іх прыйшоўся галоўны ўдар сталінскіх рэпрэсій на Беларусі.

Гаворачы аб стаўленні да праблемы беларускай дзяржаўнасці прадстаўнікоў эміграцыі, трэба зазначыць, што ў гэты час беларускае замежжа не было адзіным цэлым, а ўяўляла шэраг палітычных груповак. Яны не былі аднароднымі ні па складу, ні па становішчу ў краіне знаходжання, ні па ўплыву на падзеі. Найбольш шматлікай была групоўка ў Заходняй Беларусі, якая таксама распадалася на некалькі накірункаў пераважна па прынцыпу знешнепалітычнай арыентацыі і адрознення ў метадах палітычнай барацьбы. Нягледзячы на тое што фактычна ўсе яны мелі агульную палітычную платформу, якая грунтавалася на непрызнанні Рыжскай мірнай дамовы і развіцці нацыянальнага жыцця беларусаў у ІІ Рэчы Паспалітай, былі паміж імі і значныя адрозненні.

Калі характарызаваць асноўны вектар развіцця беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў пярыяд з 1923 па 1927 г., то ён вызначаўся падзелам беларускіх партый на правае і левае крыло, змяншэннем уплыву першага і дрэйфам другога да ўсё большай прасавецкай арыентацыі. На наш погляд, гэта тлумачыцца наступнымі прычынамі: па-першае, урад БНР так і не здолеў прарвацца на міжнародную арэну як цэнны суб'ект міжнароднага права, што паступова пазбаўляла яго прывабнасці ў якасці цэнтра беларускага нацыянальнага руху; па-другое, на фоне рэпрэсій, якія ўзмацняліся з боку польскіх улад, і росту ў іх шавіністычных настрояў, фактычна немагчымым было праводзіць узважаную палітычную лінію. Партыі павінны былі ці займаць праўрадавую пазіцыю і тым самым страчваць падтрымку сярод шырокіх мас насельніцтва, ці радыкалізавацца, што немінуча штурхала іх да саюзу з камуністамі. Па-трэцяе, беларускія партыі зноў апынуліся паміж «молатам і кавадлам» – імкненнем кіраўніцтва Польшчы цалкам ліквідаваць любы беларускі рух і жаданнем савецкага кіраўніцтва цалкам гэты рух падпарадкаваць.

1923 г. з'явіўся пераломным і ў гісторыі БНР. Як ужо адзначалася, стабілізацыя палітычнага і эканамічнага становішча ва Усходняй Еўропе прывяла да таго, што беларускае пытанне стала разглядацца як нешта непатрэбнае ці нават небяспечнае. З гэтай нагоды прадстаўнікі БНР і партый, якія на яе арыентаваліся, паступова страчвалі дапамогу з боку ўрадаў іншых краін. Больш за ўсё яны атрымлівалі падтрымку з боку кіраўніцтва Літвы, але пасля канчатковага далучэння ў 1923 г. «Сярэдняй Літвы» да Польшчы і яно паступова страчвае інтарэс да беларускага пытання. Увогуле, палітыка літоўскага ўрада ў гэтым годзе рэзка пачала мяняцца, а гэта прывяло да таго, што 1 лістапада 1923 г. Прэзідыум Рады і ўрад БНР былі вымушаны пакінуць Літву і пераехаць у Чэхаславакію. З гэтага часу цэнтрам беларускай палітычнай эміграцыі стала Прага.

Сітуацыю ўскладняў і раскол у нацыянал-дэмакратычным руху. Першапачатковая розніца ў поглядах па праблеме знешнепалітычнай арыентацыі выйілася ў адкрытае супрацьстаянне з яўнымі спробамі дыскрэдытацыі палітычных апанентаў. Нягледзячы на шматразовыя спробы, так і не атрымалася дамовіцца ў прадстаўнікоў «вышэйшай» і «найвышэйшай» рад.

Акрамя гэтага, падаўленне палякамі партызанскага руху і ўнутраны раскол БПС-Р (з яе выйшла Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя) прыводзяць да паступовага заняпаду гэтай партыі, і ў чэрвені 1924 г. пад ціскам КП(б)Б на з'ездзе былых членаў БПС-Р прымаецца рашэнне аб яе самароспуску. Гэта не магло не адбіцца на пазіцыях БНР, паколькі менавіта БПС-Р з'яўлялася яе галоўнай апорай.

Усё вышэйпералічанае прывяло да таго, што значную частку прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху апанавалі песімістычныя настроі. Змаганне на два фронты здавалася ім бесперспектыўнай справай, вырашэнне беларускага пытання ў Польшчы – марнай ілюзіяй. Гэта прымусіла іх усё больш схіляцца ў бок падтрымкі БССР, як галоўнага аб'ядноўчага цэнтра ўсіх беларускіх сіл, што, дарэчы, мела свае падставы. Так, на той момант фактычна толькі БССР з'яўлялася нейкім падабенствам беларускай дзяржаўнасці, ва ўсялякім разе яна, безумоўна, уяўляла сабой нацыянальна-культурную аўтаномію. Акрамя таго, новая эканамічная палітыка, беларусізацыя, узбуйненне тэрыторыі і ўмелая прапаганда дасягненняў у БССР парадзілі ў часткі беларускіх дзеячаў пэўныя спадзяванні.

На наш погляд, прычынай з'яўлення падобных настрояў былі не толькі цяжкасці, з якімі ў той час сутыкнулася кіраўніцтва БНР, але і дастаткова разумная палітыка ўрада Савецкай Беларусі ў дачыненні да беларускай эміграцыі. Безумоўна, урад Беларусі не магло не раздражняць існаванне «ўрада ў выгнанні», тым больш што апошні не сядзеў склаўшы рукі. Яго прадстаўнікі звярталіся ва ўсе магчымыя арганізацыі з мэтай прыцягнення ўвагі да Беларусі. Але кіраўніцтва БССР не пайшло на адкрытую канфрантацыю, а завязала дыпламатычную гульню, канчатковай мэтай якой было прызнанне БССР адзіным беларускім цэнтрам. Праца вялася па некалькіх накірунках: стварэнне «ўзорнай рэспублікі» з мэтай прапаганды савецкага ладу жыцця; абвяшчэнне палітычнай амністыі тым праціўнікам савецкай улады, якія не выступалі супраць яе са зброяй у руках, і прапанова вяртання на радзіму; фінансавая дапамога лаяльнай часткі эміграцыі.

У 1925 г. кіраўніцтвам БССР фактычна быў распрацаваны план, скіраваны на ліквідацыю БНР. Распачало гэты працэс пасяджэнне бюро ЦК КП(б)Б, якое адбылося 6 студзеня 1925 г.; на ім было прызнана мэтазгодным ліквідаваць «беларускі народны ўрад», з тым каб гэтая ліквідацыя суправаджалася дэкларацыяй дадзенага ўрада на

карысць Савецкай Беларусі [1]. Дакладней кажучы, ініцыятыва зыходзіла з Масквы, паколькі дакладаў па дадзенаму пытанню М. Ітві, які быў упаўнаважаным наркамата замежных спраў СССР пры ўрадзе БССР.

Вынікам гэтай дзейнасці з'явілася тое, што 15 кастрычніка 1925 г. адбылася II Усебеларуская канферэнцыя ў Берліне, на якой прысутнічала 17 дэлегатаў. Канферэнцыя прыняла пастанову, у якой гаварылася: «У свядомасці таго, [што] улада сялян і работнікаў, замацаваная ў Менску – сталіцы Радавай Беларусі, запраўдна імкнецца адрадзіць Беларускі народ культурна, эканамічна і дзяржаўна, што Радавая Беларусь ёсць адзіная рэальная сіла, якая можа вызваліць Заходнюю Беларусь ад польскага іга, у поўным паразуменні з краявымі арганізацыямі. ПАСТАНАВІЛІ: спыніць існаванне Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі і прызнаць Менск адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі» [2].

Фармальна прадстаўнікі Савецкай Беларусі дабіліся свайго, але, на самай справе, усё было не так гладка, паколькі Прэзідыум Рады БНР рашэнні канферэнцыі не прызнаў, на што ў яго былі пэўныя падставы. Па-першае, гэта супярэчыла ранейшым пастановам Рады, па якіх урад не мог прымаць самастойныя рашэнні, а таксама збірацца асобна ад Прэзідыума Рады БНР. Па-другое, Цвікевіч быў толькі выконваючым абавязкі Старшыні Рады Міністраў. Больш таго, напярэдадні канферэнцыі яе ўдзельнікі склалі з сябе афіцыйныя абавязкі і прымалі ў ёй удзел як прыватныя асобы.

Такім чынам, цалкам ліквідаваць стуктуры БНР не атрымалася. Але пасля 1925 г. усё больш і больш прадстаўнікоў эміграцыі перабіраецца ў Беларусь ці паступова адыходзіць ад палітычнай дзейнасці. Фактычна толькі невялікая група беларускай палітычнай эміграцыі, што гуртавалася вакол Старшыні Рады БНР П. Крачэўскага, засталася вернай ідэалу Беларускай Народнай Рэспублікі і не прызнала Савецкую Беларусь.

У гэты ж час адбываецца выкрышталізоўванне савецкага разумення ідэі беларускай дзяржаўнасці. Этапным у гэтым сэнсе з'явіўся 1927 г., калі адбыўся VIII Усебеларускі з'езд Саветаў, які прыняў II Канстытуцыю БССР.

Фактычна распрацоўка новай канстытуцыі пачалася яшчэ ў 1924 г. пасля прыняцця Канстытуцыі СССР, што патрабавала адпаведных змен у канстытуцыях рэспублік, якія ўвайшлі ў яго склад. Але паколькі першы варыянт, распрацаваны ў 1924–1925 гг., быў адхілены з нагоды занадта шырокіх паўнамоцтваў вышэйшых органаў рэспублікі [3], то працэс прыняцця канстытуцыі зацягнуўся аж да 1927 г. Гэтая канстытуцыя мела на мэце не толькі ўнармаваць дзейнасць усіх дзяржаўных органаў БССР, але і вызначыць іх кампетэнцыю ў складзе СССР.

У вызначэнні характару дзяржавы прадстаўнікамі розных беларускіх колаў уздымалася пытанне аб замене лозунга «дыктатуры пралетарыяту» на лозунг «дыктатуры працоўнага народа», паколькі пралетарыят у Беларусі быў нешматлікі. Аднак перамог першы варыянт. Гэта было зроблена пад ціскам цэнтральнага кіраўніцтва СССР, бо незразумела, чаму дадзенае палажэнне адсутнічала ў Канстытуцыіі РСФСР 1925 г.

Увогуле, параўнанне гэтых дзвюх Канстытуцый (РСФСР 1925 г. і БССР 1927 г.) дае даволі цікавы матэрыял для даследчыка. Паколькі Канстытуцыя БССР 1927 г., па сутнасці, спісана з Канстытуцыі РСФСР 1925 г., найбольшую цікавасць уяўляюць тыя разыходжанні, якія назіраюцца ў тэкстах. Яны цікавыя нам з двух бакоў – як сведчанне эвалюцыі поглядаў на асновы дзяржаўнага ладу ў перыяд 1925–1927 гг. і як

адлюстраванне пэўных адрозненняў у стане РСФСР і БССР у рамках СССР. Звернемся, на наш погляд, да больш значных з іх.

Першае. Зменены парадак артыкулаў. У Канстытуцыі РСФСР 1925 г. 4-м ідзе артыкул аб свабодзе сумлення [4], у той час як у Канстытуцыі БССР гэтаму прысвечаны артыкул 12, а ў 4-м ідзе гаворка аб узаемаадносінах і месцы БССР у складзе СССР [5]. Гэта надае Канстытуцыі БССР іншую, больш вытрыманую ідэалагічную афарбоўку ва ўмовах згортвання НЭПа.

Другое. Узмоцнены пэўныя ідэалагічныя моманты ў бок дагматычнага разумення марксізму. Напрыклад, у артыкуле 2 Канстытуцыі РСФСР гаворыцца: «Российская Республика есть социалистическое государство рабочих и крестьян, строящееся на основе федерации национальных советских республик» [4]. Адпаведны артыкул у Канстытуцыі БССР гучыць у наступнай рэдакцыі: «Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка ёсць сацыялістычная дзяржава дыктатуры пралетарыяту, якая ажыццяўляе свае задачы на грунце саюзу рабочых і сялян» [5].

Трэцяе. Непасрэдныя разыходжанні ў тэкстах (г. зн. наяўнасць ці адсутнасць пэўных частак). Безумоўна, у межах дадзенай працы немагчыма прааналізаваць іх усе, таму засяродзімся на некаторых з іх. На наш погляд, найбольш значнымі разыходжаннямі з'яўляюцца наступныя: адсутнасць у Канстытуцыі БССР палажэння аб фарміраванні бюджэту рэспублікі і кантролі за ім; наяўнасць палажэнняў аб мове і тэрыторыі.

Але калі разглядаць працэсы, што праходзілі ў той час на Беларусі, як комплекс дзяржаўна-нацыянальнай творчасці, то, нягледзячы на пройгрыш на дзяржаўным накірунку, на нацыянальным змаганне яшчэ працягвалася. Гэта знайшло адлюстраванне ў Канстытуцыі БССР 1927 г. Так, у ёй змешчаны артыкул 22, які не толькі не мае аналагаў у Канстытуцыі РСФСР, але па свайму духу адпавядае папярэдняму працэсу нацыянальнага адраджэння, хаця ў дадзены час пачыналася яго імклівае згортванне і да першых працэсаў над беларускай інтэлігенцыяй заставалася менш за два гады.

Магчыма, яшчэ большую цікавасць мае частка «б» артыкула 24, у якой гаворыцца: «Да выключнай кампетэнцыі Усебеларускага з'езду Саветаў належыць... вырашэньне, у адпаведнасьці з Канстытуцыяю Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, пытаньняў аб зьмене граніц Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі» [5].

Гэта сведчыць, на нашу думку, што тэрытарыяльнае пытанне ў гэты час таксама лічылася канчаткова не вырашаным.

У плоскасці развіцця ідэі беларускай дзяржаўнасці вышэйсказанае азначае наступнае: вымушанае паступіцца дзяржаўным суверэнітэтам кіраўніцтва БССР сканцэнтравала сваю ўвагу на тых накірунках, дзе нацыянальна-дзяржаўная творчасць была яшчэ магчыма. Гэта – культурніцкае адраджэнне і збіранне беларускіх этнаграфічных земляў. У 1927 г. яно не лічыла неабходным згортваць дадзеныя працэсы.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна зрабіць наступныя вывады: у дадзены перыяд фактычна ліквідуюцца колькі-небудзь значныя цэнтры небальшавіцкага накірунку ў дзяржаўна-нацыянальным будаўніцтве Беларусі, і дзеячы савецкай арыентацыі пачынаюць прэтэндаваць на ролю манапалістаў у гэтай сферы. Гэтыя

прэтэнзіі падмацоўваліся тым, што беларуская дзяржаўнасць у нейкім рэальным увасабленні існавала толькі ў выглядзе БССР.

З другога боку, несамастойнасць БССР была відавочная для яе апанентаў. Акрамя таго, класавы характар рэспублікі не дазваляў у поўнай меры лічыць яе нацыянальнай, паколькі прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнага накірунку неаднаразова звярталі ўвагу на сялянскі характар беларускай нацыі і былі схільныя да эсэраўскага лозунга «дыктатуры працоўнага народа».

Такім чынам, можна зазначыць, што ў дадзены перыяд у беларускім нацыянальным руху ўсталявалася два погляды на праблему рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. Першы быў схільны разглядаць БССР як практычнае ўвасабленне барацьбы беларускага народа за сваю дзяржаўнасць, а асаблівасці яе становішча адносіў да спецыфікі існавання сацыялістычнай краіны ў працэсе станаўлення яе дзяржаўнасці. Другі разглядаў БССР як квазірэспубліку са скажоным першапачатковым ідэалам і таму адкладваў вырашэнне беларускага пытання на аддаленую перспектыву, што, безумоўна, не магло не выклікаць пэўную расчараванасць і моцна звузіць кола яго прыхільнікаў.

ЛІТАРАТУРА

1. НАРБ. Ф. 4, воп. 3, сп. 6, л. 6.
2. Архівы БНР. Т. 2. – С. 1632.
3. Круталевіч В.А., Юхо І.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.). – Мн.: Беларуская навука, 1998. – С. 158.
4. Конституционное право России. Основные законы, конституции и документы XVIII–XX веков. Хрестоматия. – Новосибирск: ООО «Издательство ЮКЭА», 2000. – С. 523.
5. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі. Афіцыйнае выданне. – Менск, 1927. – С. 3–4.

УДК 792.03 (476)

Н.І. Наркевіч, асістэнт

## РАЗВІЦЦЁ ТЭАТРАЛЬНАГА РУХУ НА БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ 1917 Г.

Processes of creation and development of professional theatre groups after 1917 in Belarus are analyzed in the article.

Пасля Кастрычніка 1917 г. працягвала набіраць моц нацыянальнае тэатральнае мастацтва. Важную старонку ў гісторыю фарміравання нацыянальнага сцэнічнага мастацтва ўпісала Першае беларускае таварыства драмы і камедыі, створанае ў Мінску ў 1917 г. У рэпертуары тэатра былі п'есы, пастаўленыя вясной і летам 1917 г.: «Раскіданае гняздо» і «Паўлінка» Я. Купалы, «Модны шляхцюк» К. Каганца, «У зімовы вечар» Э. Ажэшкі і інш. Найбольшы поспех у спектаклях мелі Ф. Ждановіч, У. Фальскі, А. Крыніца, Я. Белаус, а таксама У. Галубок.

У. Галубок шырока разгарнуў у таварыстве сваю драматургію, рэжысёрскую і акцёрскую дзейнасць. Тут былі пастаўлены яго творы «Апошняе спатканне», «Пісаравы імяніны», «Бязвінная кроў».

У першыя паслярэвалюцыйныя месяцы таварыства ўяўляла сабой прафесійны тэатр, хоць яно і не знаходзілася на дзяржаўным утрыманні. Адсутнасць дастатковых